ЗАЦВЯРДЖАЮ
Начальнік упраўлення культуры Гродзенскага абласнога выканаўчага камітэта
А.В.Клімовіч
2025 г.

# ІНСТРУКЦЫЯ
аб парадку арганізацыі
і правядзення адкрытага абласнога
фестывалю роставых лялек

1. Дадзеная Інструкцыя вызначае парадак арганізацыі і правядзення абласнога адкрытага фестывалю роставых лялек (далей – Фестываль).

2. Мэтамі і задачамі Фестывалю з’яўляюцца: папулярызацыя і актывізацыя дэкаратыўна-прыкладнога, тэатральна-гульнёвага жанру, павышэнне прафесійнага ўзроўню і выканальніцкага майстэрства культарганізатараў, вядучых сюжэтна-забаўляльных праграм; стварэнне новых форм работы, тэатральна-гульнёвых праграм і далейшае выкарыстанне іх у сучасных мерапрыемствах; садзейнічанне выяўленню, вывучэнню і распаўсюджванню разнастайных інтэрактыўных форм, абагульненню існуючага вопыту і яго ўкараненню ў практыку клубнай работы.

3. Арганізатарамі Фестывалю з’яўляюцца: упраўленне культуры Гродзенскага аблвыканкама, дзяржаўная ўстанова культуры “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці” (далей – ДУК “Гродзенскі АМЦНТ”, сектар культуры Дзятлаўскага раённага выканаўчага камітэта.

4. Пры арганізацыі, падрыхтоўцы і правядзенні Фестывалю арганізатары і ўдзельнікі кіруюцца заканадаўствам Рэспублікі Беларусь і дадзенай Інструкцыяй.

5. Агульнае кіраўніцтва падрыхтоўкай і правядзеннем Фестывалю ажыццяўляецца арганізацыйным камітэтам (далей – аргкамітэт), склад якога зацвярджаецца дадаткова (Дадатак 1).

6. Аргкамітэт пакідае за сабой права ўносіць змены ў дадзеную Інструкцыю аб парадку арганізацыі і правядзення, а таксама аб пераносе даты правядзення Фестывалю (у іншыя тэрміны).

7. Фестываль праводзіцца 1 раз у 2 гады.

8. У 2025 годзе Фестываль адбудзецца 14 чэрвеня ў г.Дзятлава.

9. У выпадку пераносу тэрмінаў правядзення Фестывалю ці яго адмены па аб’ектыўных прычынах удзельнікі, якія даслалі заяўкі, будуць паведамлены індывідуальна.

10. Праграма Фестывалю прадугледжвае тэатралізаванае шэсце, урачыстае адкрыццё, конкурсныя прагляды, падвядзенне вынікаў і ўзнагароджванне прызамі і дыпломамі ў рамках.

11. У Фестывалі прымаюць удзел: аматарскія калектывы з найменнем “народны” і “ўзорны”, культарганізатары і рэжысёры ўстаноў культуры і адукацыі Гродзенскай вобласці. Калектывы і аніматары, якія выкарыстоўваюць роставыя лялькі ў сваіх пастаноўках з рэгіёнаў Беларусі.

12. З мэтай творчай вучобы на Фестываль запрашаюцца кіраўнікі ўстаноў культуры клубнага і змешанага тыпаў Гродзенскай вобласці.

13. Па рашэнні аргкамітэта на Фестываль могуць быць запрошаны творчыя калектывы з іншых абласцей Рэспублікі Беларусь і іншых краін.

14. У рамках Фестывалю праводзіцца конкурс на “Лепшае інтэрактыўнае (гульнёвае), тэатралізаванае, сюжэтна-забаўляльнае, гумарыстычнае прадстаўленне” (далей – Конкурс) для розных узроставых катэгорый насельніцтва (да 20 хвілін).

15. Па выніках Конкурсу журы (Дадатак 2) вызначае Гран-пры Фестывалю, лаўрэатаў I, II, III ступені і ўзнагароджвае пераможцаў прызамі, дыпломамі ў рамках і памятнымі сувенірамамі.

16. Астатнія ўдзельнікі Фестывалю атрымліваюць дыпломы ў рамках за ўдзел і памятныя сувеніры Фестывалю.

17. Пры падвядзенні вынікаў Фестывалю журы карыстаецца наступнымі крытэрыямі: сцэнічная культура і ўзровень выканальніцкага майстэрства; выкарыстанне сучаснага матэрыялу; артыстызм; мастацкі ўзровень сцэнарнага матэрыялу; арыгінальнасць выканання.

18. Рашэнне членаў журы па выніках конкурсных праглядаў фіксуецца ў пратаколе (падпісваюць усе члены журы), які размяшчаецца не пазней 10 каляндарных дзён з дня правядзення на афіцыйным сайце ДУК “Гродзенскі АМЦНТ”.

19. Рашэнне журы з’яўляецца канчатковым і перагляду не падлягае.

20. Для ўдзелу ў Фестывалі неабходна да 15 мая 2025 г. даслаць заяўку (Дадатак 3) на электронны адрас ДУК “Гродзенскі АМЦНТ” info@gromc.by з пазнакай “Фестываль роставых лялек”. Кантактныя тэлефоны: +375152 62 37 85.

21. Кожны ўдзельнік Фестывалю ўдзельнічае ў касцюміраваным тэатралізаваным шэсці, для якога неабходна мець таблічку з назвай калектыву; рыхтуе лялечнае прадстаўленне-прэзентацыю (да 2 хвілін) для прадстаўлення калектыву на цэнтральнай сцэнічнай пляцоўцы Фестывалю.

22. Фінансаванне Фестывалю ажыццяўляецца за кошт сродкаў абласнога бюджэту, прадугледжаных у каштарысе ДУК “Гродзенскі АМЦНТ”.

23. За кошт бюджэтных сродкаў фінансуюцца: Гран-пры, прызы, памятныя сувеніры, дыпломы, рамкі для дыпломаў.

24. Для фінансавання Фестывалю могуць быць выкарыстаны іншыя крыніцы, не забароненыя заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

25. Арганізатары Фестывалю захоўваюць неабмежаваныя правы на запіс і распаўсюджванне выступленняў калектываў рознымі тэхнічнымі сродкамі і спосабамі. За дадзеныя запісы ганарары выканаўцам не выплачваюцца.

Дадатак 1
да Інструкцыі аб парадку арганізацыі і правядзення адкрытага абласнога фестывалю роставых лялек

# СКЛАД АРГКАМІТЭТА
## адкрытага абласнога фестывалю роставых лялек

| | |
|---|---|
| Клімовіч А.В. | начальнік упраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама, *старшыня аргкамітэта*; |
| Бялятка В.А. | намеснік старшыні Дзятлаўскага райвыканкама, *сустаршыня аргкамітэта;* |
| Хільмончык К.В. | дырэктар ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці”, *намеснік старшыні аргкамітэта;* |
| Шыцько В.В. | загадчык сектара культуры Дзятлаўскага райвыканкама; |
| Рагачова В.М. | начальнік аддзела ідэалагічнай работы і па справах моладзі Дзятлаўскага райвыканкама; |
| Камарова І. Ч. | галоўны рэдактар раённай газеты “Перамога”; |
| Крывіцкая С.В. | вядучы метадыст ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці”; |
| Пекар А.Ю. | галоўны спецыяліст аддзела культурна-асветнай работы, мастацтваў і навучальных устаноў Гродзенскага аблвыканкама |

Дадатак 2
да Інструкцыі аб парадку арганізацыі і правядзення адкрытага абласнога фестывалю роставых лялек

## СКЛАД ЖУРЫ
адкрытага абласнога фестывалю роставых лялек

| | |
|---|---|
| Куратчык С.В. | намеснік начальніка ўпраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама, *старшыня журы;* |
| Пекар А.Ю. | галоўны спецыяліст аддзела культурна-асветнай работы, мастацтваў і навучальных устаноў упраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама, *сустаршыня журы;* |
| Хільмончык К.В. | дырэктар ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці”, *намеснік старшыні журы;* |
| Шыцько В.В. | загадчык сектара культуры Дзятлаўскага райвыканкама; |
| Маліноўская Н.М. | дырэктар ДУК “Дзятлаўскі раённы цэнтр культуры і народнай творчасці”; |
| Рагачова В.М. | начальнік аддзела ідэалагічнай работы і па справах моладзі Дзятлаўскага райвыканкама; |
| Хілімончык К.У. | першы сакратар Дзятлаўскага раённага камітэта ГА “Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі” |

Дадатак 3
да Інструкцыі аб парадку арганізацыі і правядзення адкрытага абласнога фестывалю роставых лялек

ЗАЯЎКА
на ўдзел у адкрытым абласным фестывалі роставых лялек

1. Поўная назва калектыву і базавая ўстанова дзейнасці калектыву ___________
_______________________________________________________________
2. Колькасць роставых лялек, прымаючых удзел у фестывалі _____________
_______________________________________________________________
_______________________________________________________________
_______________________________________________________________

3. Колькасць аніматараў, прымаючых удзел у фестывалі _________________
_______________________________________________________________
4. Назва праграмы інтэрактыўнага тэатралізаванага прадстаўлення ____
_______________________________________________________________
_______________________________________________________________
5. Працягласць праграмы _________________________________________
6. Пашпартныя дадзеныя (нумар, калі і кім выдадзены) мастацкага кіраўніка калектыву ці асобнага выканаўцы ____________________________
_______________________________________________________________
7. Тэхнічны райдар ______________________________________________
_______________________________________________________________
8. Кантактны тэлефон _____________________________________________

Кіраўнік базавай установы _______________________
подпіс